Бібліятэчным абслугоўваннем за адзначаны перыяд займаліся **40** дзіцячых бібліятэк, з іх **19** раённых дзіцячых бібліятэк (ёсць ва ўсіх раённых сетках бібліятэк акрамя Віцебскай і Аршанскай), **17** гарадскіх дзіцячых бібліятэк, **4** гарпасялковыя дзіцячыя бібліятэкі. Абслугоўваннем дзіцячага чытача таксама займаюцца і іншыя бібліятэкі вобласці: цэнтральныя раённыя і гарадскія бібліятэкі, сельскія бібліятэкі-філіялы, бібліятэкі аграгарадкоў.

У сукупнасці асноўныя паказчыкі работы дзіцячых бібліятэк застаюцца стабільнымі. Трэба адзначыць, што знізілася колькасць карыстальнікаў у параўнанні з 2010 годам. Сучаснае юнацтва аддае перавагу мультымедыйным сродкам, камп'ютарным гульням і іншым магчымасцям, якія прадстаўляе сёння глабальная сетка. Бібліятэкі вобласці імкнуцца павялічыць колькасць чытачоў шляхам стварэння ўмоў для максімальнага задавальнення чытацкіх запытаў.

94 экз.

Прынятая на 2011-2015 гг. Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі" прадугледжвае павелічэнне паказчыка абнаўлення фонду ў нашай рэспубліцы да 5%. Па нашай вобласці гэты паказчык састаўляе 4,5%, але ёсць раёны, дзе гэты паказчык склаў усяго 3% (Віцебская РЦБС, Ушацкая ЦБС).

Прыярытэтным напрамкам пры камплектаванні фондаў бібліятэк Віцебскай вобласці з'яўляецца набыццё сацыяльна значнай літаратуры, якая выпускаецца ў межах дзяржзаказу за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў. У 2011 годзе набыта 25,4 тыс. экз. СЗЛ на агульную суму 539,6 млн. рубл. (у 2010 годзе – 15,3 тыс. экз на агульную суму 253,1 млн.руб.). Больш за іншых СЗЛ набылі Глыбоцкая ЦБС (3103 экз.), Віцебская ГЦБС (2327 экз.), Аршанская ГЦБС (2194 экз.), Докшыцкая ЦБС (1690 экз.), Браслаўская ЦБС (1442 экз.).Што тычыцца выбыцця дакументаў, то за справаздачны год было спісана 385,7 тыс. дакументаў, што на 8% больш, чым у мінулым годзе (351,7 тыс. дакументаў – 2010 г.).

Бібліятэкі павінны забяспечваць доступ чытачоў да дакументаў на розных носьбітах інфармацыі, таму для бібліятэк Віцебскай вобласці было набыта 1915 экз. электронных дакументаў (для абласной бібліятэкі – 14 экз.) рознай тэматыкі і відавога складу. Стварэнне камфортнага асяродка для чытачоў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі бібліятэкі Віцебскай вобласці разглядаюць як адну з важнейшых задач. У 2011 годзе для гэтай катэгорыі чытачоў было набыта 970 экз. агучанай літаратуры на суму 40 млн. руб.

За перыяд рэалізацыі "Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005– 2010 гады" пачалі функцыянаваць абсталяваныя па сучасных патрабаваннях 257 бібліятэк у аграгарадках. На сённяшні дзень яны задавальняюць інфармацыйныя запатрабаванні насельніцтва, для чытачоў сфарміраваны разнастайныя па складзе і змесце фонды. Наведвальнікі бібліятэк маюць доступ да Internet-рэсурсаў, магчымасць карыстацца электроннай поштай. Зона абслугоўвання бібліятэк

аграгарадкоў уключае 2290 населеных пунктаў. У 2011 годзе ў іх пражывала 199,7 тыс. чалавек, з іх 29,5 тыс. дзяцей да 15 гадоў.

Агульны фонд бібліятэк аграгарадкоў павялічваецца кожны год, і зараз ён налічвае 2 млн. 265 тыс. экз. (+62,6 тыс.экз. да мінулага года), кнігавыдача склала 2 млн. 393 тыс экз. дакументаў). За справадачны год новыя паступленні дакументаў у фонды бібліятэк аграгарадкоў склалі 120,8 тыс. экз., што на 18,3 тыс. больш, чым у мінулым годзе. У сярэднім адна бібліятэка аграгарадка атрымала 220 экз. кніг.

На пачатак 2012 года ў бібліятэках аграгарадкоў налічвалася 216 кам'ютараў, падключаны да сеткі Internet 154 бібліятэкі і маюць электронную пошту 146 бібліятэк. Абслугоўваннем насельніцтва аграгарадкоў займаліся 317 бібліятэкараў, з іх вышэйшую адукацыю маюць 77 супрацоўнікаў (37 – вышэйшую бібліятэчную), сярэднюю спецыяльную – 200 чалавек (138 з іх – бібліятэчную).

Прыярытэтныя напрамкі ў сферы аўтаматызацыі бібліятэчных тэхналогій былі вызначаны "Рэспубліканскай праграмай інфарматызацыі галіны культуры на 2005 год і на перыяд да 2010 года". Фінансаванне данага працэсу ажыццяўлялася за сродкі, выдаткаваныя з мясцовых бюджэтаў і часткова за грошы, атрыманыя ад пазабюджэтнай дзейнасці бібліятэк.

На пачатак 2012 года ў вобласці кам'пютарызаваны 297 бібліятэк (46,8% ад агульнай колькасці бібліятэк вобласці). Колькасць камп'ютараў па вобласці складае 723 (камп'ютарны парк абнавіўся на 15 машын). 209 бібліятэк маюць доступ да інтэрнет (33,0% ад агульнай колькасці бібліятэк), 199 бібліятэк (31,3%) – электронную пошту. Уласныя сайты маюць Гарадоцкая, Докшыцкая, Лёзненская, Лепельская, Міёрская, Аршанская РЦБС, Пастаўская, Чашніцкая, Шаркаўшчынская, Шумілінская ЦБС, а таксама 3 гарадскія ЦБС (Віцебская, Наваполацкая, Полацкая).

У мінулым годзе публічныя бібліятэкі вобласці працягвалі актывізацыю дзейнасці па аказанні **платных паслуг**. Даходы ад платных

дырэктары ЦБС, нарадах раённых і гарадскіх бібліятэк: "Вядзенне дакументацыі па платных паслугах", "Работа бібліёбуса па абслугоўванні чытачоў у аддаленых населеных пунктах", "Аб выкарыстанні камп'ютарных тэхналогій ў бібліятэках ЦБС", "Рэкламная дзейнасць бібліятэк", " Аб рабоце бібліятэк па прапагандзе здаровага ладу жыцця", "Аб арганізацыі вольнага часу насельніцтва бібліятэкамі ЦБС", " Аб сумеснай рабоце бібліятэк з іншымі арганізацыямі і ўстановамі раёна", "Формы і метады масавай работы: ад тэорыі да практыкі", "Аб выкананні сацыяльных стандартаў па бібліятэчным абслугоўванні насельніцтва", "Сучасны дызайн і афармленне ў бібліятэцы", "Краязнаўства – прыярытэтны напрамак дзейнасці бібліятэк", "Арганізацыя клубаў па інтарэсах і аматарскіх аб'яднанняў" і інш.

Па меркаванні бібліятэкараў, самай эфектыўнай формай метадычнай дзейнасці з'яўляюцца выезды і наведванні, якія дапамагаюць не толькі абагульніць вопыт работы, але і ліквідаваць недахопы ў рабоце бібліятэк. У справаздачным годзе супрацоўнікамі цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэк было зроблена звыш 2 тыс. выездаў і наведванняў з аказаннем метадычнай і практычнай дапамогі.

Рэгулярна праз сродкі масавай інфармацыі супрацоўнікі многіх ЦБС вобласці знаёмілі чытачоў і бібліятэкараў з найбольш значнымі і цікавымі падзеямі ў бібліятэчным жыцці сваіх рэгіёнаў. Работа бібліятэк сістэмы рэкламавалася праз мясцовае радыё і тэлебачанне. Па-ранейшаму актыўна рэкламуюць сваю дзейнасць бібліятэкары Бешанковіцкай, Браслаўскай, Глыбоцкай, Міёрскай, Сенненскай, Талачынскай ЦБС, Віцебскай і Аршанскай ГЦБС.

На сённяшні дзень вельмі актуальна стварэнне электронных прэзентацый, без якіх не абыходзіцца ўжо ніводнае мерапрыемства. Найбольш прадуктыўна працуюць у дадзеным накірунку гарадскія ЦБС вобласці.

Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што многія бібліятэкі Віцебшчыны пераўтварыліся ў сапраўдныя інфармацыйныя і культурныя

(Глыбоцкая, Аршанская РЦБС, Віцебская ГЦБС); **практыкумы-трэнінгі** для бібліятэкараў, якія не маюць бібліятэчнай адукацыі, **практыкумы-трэнінгі** для супрацоўнікаў бібліятэк, якія працуюць на камп'ютары "Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій у дзейнасці бібліятэк" (Гарадоцкая, Віцебская РЦБС, Дубровенская, Лепельская, Талачынская, Шумілінская ЦБС); **творчая лабараторыя**, **інтэлект-трэнажор** " Прочитав, я узнала" (Наваполацкая ГЦБС).

Павышэнню творчага патэнцыялу супрацоўнікаў бібліятэк, пошуку новых формаў і метадаў работы з чытачамі, рэкламе бібліятэк спрыяюць **рэспубліканскія, абласныя** і **раённыя агляды-конкурсы** па розных напрамках бібліятэчнай дзейнасці. На працягу 20- ці гадоў бібліятэкі вобласці прымаюць актыўны ўдзел у рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры".

Былі праведзены конкурсы сярод супрацоўнікаў гарадскіх і раённых ЦБС: "Летом в библиотеке" (на лепшы праект праграмы летніх чытанняў), "Роль рекламы в создании привлекательного образа современной библиотеки" (Віцебская ГЦБС, Гарадоцкая ЦБС); "Галасы зніклых вёсак" (Лёзненская ЦБС); "Інавацыйны праект па прыцягненні пазабюджэтных і спонсарскіх сродкаў у бібліятэку" (Наваполацкая ЦБС); "Бібліятэка. Интэр'ер. Імправізацыя" (Чашніцкая ЦБС); "Твори, выдумывай, пробуй, или Что может книжная выставка" (Полацкая РЦБС, Шумілінская ЦБС); "Палітра прафесійнага майстэрства" (Докшыцкая ЦБС); "На лепшую пастаноўку работы ў бібліятэках аграгарадкоў" (Верхнядзвінская ЦБС); "Лепшае аматарскае аб'яднанне ў бібліятэцы" (Пастаўская ЦБС); "Читаем дома, читаем с друзьями, читаем в свободное время", "Лучшее библиотечное портфолио"(Аршанская РЦБС); на лепшы сцэнарны матэрыял і лепшую работу бібліятэкі па папулярызацыі творчасці М. Багдановіча "Паэтычная зорка паэта " (Браслаўская, Сенненская, Полацкая ГЦБС, Пастаўская ЦБС, Шаркаўшчынская ЦБС).

Праблемныя пытанні, прыярытэтныя накірункі дзейнасці бібліятэк разглядаліся на **Саветах аддзелаў культуры і Саветах пры**

паслуг бібліятэкамі вобласці склалі 1 млрд. 15 млн. 300 руб. (83% ад плана).

З улікам сваіх магчымасцяў і запытаў карыстальнікаў бібліятэкі вобласці аказвалі ад 25 (Браслаўская, Аршанская РЦБС, Сенненская, Наваполацкая, Пастаўская ЦБС) да 40 (Віцебская ГЦБС, Гарадоцкая, Верхнядзвінская, Докшыцкая, Дубровенская, Лепельская, Полацкая РЦБС, Чашніцкая ЦБС) відаў платных паслуг. Абласная бібліятэка ажыццяўляла 30 відаў паслуг. Паспяхова выкарыстоўвалі ў сваёй паўсядзённай дзейнасці бібліятэкі вобласці наступныя віды паслуг: ксеракапіраванне дакументаў з фондаў бібліятэкі, прадстаўленне ПЭВМ для самастойнай работы з дадатковымі праграмамі, раздрукоўка на прынтары інфармацыі з электронных рэсурсаў бібліятэкі, раздрукоўка малюнкаў каляровым прынтарам, брашураванне дакументаў з выкарыстаннем пружыны і каляровай вокладкі, распрацоўка відэапрызентацый, лялечныя спектаклі з музычным суправаджэннем, арганізацыя і правядзенне масавых мерапрыемстваў па заказах карыстальнікаў, выдача кніг з камерцыйнага фонду, культурна-забаўляльныя мерапрыемствы з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій, абслугоўванне чытачоў-даўжнікоў на даму, папярэдні заказ дакументаў з фондаў бібліятэкі, афармленне чытацкіх білетаў, віртуальныя экскурсіі.

У 2011 годзе ў практыку работы былі ўведзены новыя віды платных паслуг: стварэнне электронных прэзентацый (з матэрыялаў заказчыка) (Глыбоцкая ЦБС); выкананне складанай даведкі з дапамогай электронных рэсурсаў, кам'ютарнае макетаванне (буклеты, афішы, візітоўкі) (Віцебская ГЦБС); раздрукоўка фотаздымкаў каляровым прынтарам, правядзенне тэматычных вечароў з элементамі прагляду ўрыўкаў з кінафільмаў (Дубровенская ЦБС); бліц-абанемент (выдача 1 экз. выдання тэрмінам на 1 гадзіну з фондаў чытальнай залы), правядзенне заняткаў у гуртке эстэтычнага выхавання (Наваполацкая ГЦБС); высокахуткасны інтэрнет (Докшыцкая ЦБС); арганізацыя масавых мерапрыемстваў з удзелам лялечных тэатраў (Лепельская, Сенненская

ЦБС); выстава-прадажа мяккай цацкі, віншаванне Дзеда Мароза і Снягуркі (Талачынская ЦБС); выдача на дом аудыёвізуальных матэрыялаў з відэаабанемента для карыстальнікаў ЦБ (Гарадоцкая ЦБС).

Лідэрамі па выкананні платных паслуг з'яўляюцца Аршанская РЦБС – 57 млн. руб., Чашніцкая ЦБС – 44,6 млн. руб., Лепельская ЦБС – 38 млн. руб., Пастаўская ЦБС – 37,7 млн. руб., Сенненская ЦБС – 34,4 млн. руб., Глыбоцкая ЦБС – 34,8 млн. руб., Наваполацкая ГЦБС – 90,8 млн. руб., Аршанская ГЦБС – 71,5 млн. руб.

Сродкі, атрыманыя ад аказання платных паслуг, накіроўваліся бібліятэкамі на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы, папаўненне камерцыйнага фонду і падпіску на перыядычныя выданні.

Стварэнне камфортных умоў працы для чытачоў і супрацоўнікаў бібліятэк – адна з асноўных задач, якую на працягу 2011 года вырашалі кіраўнікі і самі работнікі ўсіх ЦБС вобласці. На працягу мінулага года быў зроблены капітальны рамонт у 8-мі бібліятэках: *Богінскай, Казянскай, Друеўскай сельскіх бібліятэках Браслаўскай ЦБС; Тулаўскай, Заронаўскай сельскіх бібліятэках Віцебскай РЦБС; Астраўлянскай сельскай бібліятэцы Гарадоцкай ЦБС; Варганскай сельскай бібліятэцы Докшыцкай ЦБС.*

Пасля трохгадовай капітальнай рэкантрукцыі адкрылася *Віцебская цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*. Пасля праведзенай перапланіроўкі, плошча для абслугоўвання чытачоў павялічылася на 82 кв. м. Касметычны рамонт быў праведзены ў 100 бібліятэках вобласці. Па-ранейшаму ў аварыйным стане знаходзіцца памяшканне Лёзненскай раённай бібліятэкі, а ў мінулым годзе, у сувязі з пераездам бібліятэкі ў іншыя памяшканні (арандаваныя), яшчэ і паменшыла сваю плошчу з 650 кв.м. да 212 кв.м. Чакаюць капітальнанага рамонту Чарневіцкая сельская бібліятэка Глыбоцкай ЦБС; Барсееўская, Яськаўшчынская сельскія бібліятэкі Лёзненскай ЦБС; Глыбачанская, Матырынская, Кубліцкая сельскія бібліятэкі Ушацкай ЦБС. У неацяпляльных памяшканнях працуюць супрацоўнікі Зарубінскай, Абрубскай сельскіх бібліятэк

фарміраванні здаровага ладу жыцця " (Бешанковіцкая, Глыбоцкая ЦБС); "Дзіцячае чытанне: праблемы і перспектывы" (Верхнядзвінская, Докшыцкая ЦБС); "Кніга – спадарожніца сямейнага выхавання" (Сенненская ЦБС), "Прававыя веды – шляхі папулярызацыі" (Аршанская РЦБС, Міёрская, Пастаўская, Віцебская ГЦБС); "Работа з фондамі: арганізацыя, захаванасць, рэклама, развіццё платных паслуг" (Лёзненская ЦБС); "Сельская бібліятэка – пошук свайго месца ў інфраструктуры вёскі і грамадскім жыцці насельніцтва" (Гарадоцкая, Шаркаўшчынская ЦБС); "Процідзеянне ўплыву дэструктыўных рэлігійных сект і псіхакультаў" (Талачынская ЦБС); "Духоўна-маральнае выхаванне ў бібліятэках" (Полацкая ГЦБС, Чашніцкая ЦБС).

З кожным годам больш актыўна уваходзіць у практыку работы ЦБС правядзенне **міжраённых** семінараў. Так, у 2011 годзе сумеснымі намаганнямі біліятэкараў Лепельскай і Чашніцкай ЦБС на базе апошняй праведзены міжраённы семінар пад назвай "Дзейнасць бібліятэк па абслугоўванні насельніцтва ў сучасных сацыякультурных умовах".

Працэс навучання і павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк пастаянна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі метадыстаў. Паспяховай прызнана практыка правядзення **круглых сталоў**, тэмы які самыя розныя: "Сельская бібліятэка для дзяцей" (Бешанковіцкая ЦБС), "Браслаўская ЦБС: традыцыі, інавацыі, творчы пошук" (Браслаўская ЦБС); "Бібліятэкі сістэмы: пошук іміджа і павышэнне сацыякультурнай ролі ў грамадстве" (Віцебская РЦБС); "Бібліятэчнае абслугоўванне чытачоў у летні перыяд: праблемы і шляхі іх вырашэння" (Пастаўская ЦБС).

З мэтай удасканальвання абслугоўвання насельніцтва ў бібліятэках вобласці былі праведзены анкетаванні сярод чытачоў і бліц-апытанні "Партрэт сучаснага маладога чалавека", "Бібліятэка ў тваім жыцці", "Сучасная бібліятэка – гэта … (Пастаўская, Шаркаўшчынская ЦБС).

У сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў выкарыстоўваюцца дзейсныя формы навучання: **семінары-практыкумы**

круглыя сталы, прэс-канферэнцыі, дні прафесійных ведаў.

Удзел у семінарах дае магчымасць абменьвацца вопытам, аб'ектыўна ацэньваць свае дасягненні і параўноўваць іх з поспехамі іншых. У маі 2011 года на базе Аршанскай ГЦБС прайшоў абласны семінар для загадчыкаў дзіцячых бібліяіэк на тэму "Дзіцячая бібліятэка: творчасць – якасць – вынік". Выступленні тычыліся прыярытэтных напрамкаў дзейнасці дзіцячых бібліятэк. Удзельнікі семінара мелі магчымасць папрысутнічаць на прэзентацыі кнігі аршанскіх аўтараў С. Трафімава і Г. Трафімавай. "Они не должны исчезнуть", азнаёміцца з вопытам работы аршанскай дзіцячай бібліятэкі імя У. Караткевіча. Бібліятэкары дзіцячых бібліятэк гарадоў Віцебска, Полацка, Міёр, Лепеля і Докшыц падзяліліся вопытам распрацоўкі і рэалізацыі праграм дзіцячага чытання.

Базай для абласнога міжведамаснага семінара, які прайшоў пад назвай "Электронныя дакументы ў публічных бібліятэках: камплектаванне, захаванасць, даступнасць" стала ДУ " Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна". На семінары былі абмеркаваны пытанні: "Фондазнаўчыя асновы работы бібліятэк з электроннымі дакументамі, "Электронныя крыніцы інфармацыі ў структуры фондаў публічных бібліятэк Віцебскай вобласці, "Электронныя рэсурсы культурна-адукацыйнай дзейнасці электроннай чытальнай залы ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна". З кансультацыяй "Аб прадстаўленні штоквартальных справаздач аб камплектаванні фондаў публічных бібліятэк Віцебскай вобласці" выступіў галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама.

У рэгіёнах вобласці актыўна праводзіліся **семінары**: ў Дубровенскай ЦБС – 3, Талачынскай ЦБС – 4, Шаркаўшчынскай ЦБС – 3, Віцебскай ГЦБС – 4. Падчас раённых і гарадскіх семінараў разглядаліся актуальныя пытанні: "Краязнаўства – прыярытэтны па накірунак работы бібліятэкі" (Браслаўская, Дубровенская, Лепельская, Міёрская, Пастаўская ЦБС); "Традыцыйны і інавацыйныя формы работы бібліятэк па

Глыбоцкай ЦБС; Хацілаўскай сельскай бібліятэкі Пастаўскай ЦБС. Павялічылася колькасць тэлефанізіраваных бібліятэк у вобласці, і зараз іх колькасць складае 465 (73,3% ад агульнальнай колькасці бібліятэк вобласці).

У бібліятэках вобласці працавалі 1501 бібліятэчны работнік, з якіх 983 супрацоўнікі (65,4%) маюць бібліятэчную адукацыю; з іх вышэйшую – 29%, сярэднюю спецыяльную (бібліятэчную) – 36,4%. Найбольш высокі працэнт спецыялістаў – у Чашніцкай ЦБС (86%), Аршанскай ГЦБС (85,4%), Наваполацкай ГЦБС (83,5%); найбольш нізкі – у Расонскай ЦБС (40%), Полацкай РЦБС (46,4%), Аршанскай РЦБС (47,3%).

Прававая інфармацыя ў грамадстве – важнейшая ўмова падрымкі дзейнасці індывідуальных і калектыўных суб'ектаў на ўзроўні сучасных патрабаванняў, мэт і задач. Створаныя з мэтай найбольш поўнай рэалізацыі канстытуцыйнай нормы ў публічных бібліятэках Віцебшчыны актыўна функцыяніруюць 76 публічных цэнтраў прававой інфармацыі, сярод якіх 1 – у абласной бібліятэцы, 25 – у цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэках, 10 – у гарпасялковых, 10 – у гарадскіх, 4 – у дзіцячых бібліятэках, 26 – у сельскіх бібліятэках аграгарадкоў. Фонд літаратуры публічных цэнтраў з кожным годам павялічваецца (+3290 экз. выданняў да мінулага года) і зараз складае 70 тыс. экз. выданняў, агульная колькасць выкананых даведак – 21910.

Паслугамі ПЦПІ карысталіся звыш 14 тыс. чалавек, выдача дакументаў прававой тэматыкі склала 102641 экз.

Прававой адукацыі насельніцтва садзейнічалі разнастайныя па тэматыцы і форме мерапрыемствы: дні прававой інфармацыі, урокі права, дыскусіі, правыя гульні, вечар пытанняў і адказаў, круглыя сталы. У бібліятэках вобласці прайшлі: сітуатыўны практыкум "Закон пра мяне і мне аб законе", відэагутарка "Займальнае правазнаўства", тыдзень прававых ведаў "Абарані свае правы" (Наваполацкая ГЦБС), гадзіна інфармацыі "Твае правы, падлетак" (Гарадоцкая ЦБС), брэйн-рынг "Хто прыдумаў правы чалавека" (Міёрская ЦБС), пазнавальная гульня "Ведаць,

знаць, выконваць” (Віцебская гарадская бібліятэка імя У. Караткевіча), бліц-турнір “Абавязкі дзяржавы – твае правы” (Сенненская ЦБС), дзелавая гульня “Сам сабе адвакат” (Лёзненская ЦБС; у прававым накірунку працавалі аматарскія клубы “Сучаснік” і “Лінія” (Глыбоцкая ЦБС).

Адной з эфектыўных форм работы з’яўляюцца мэтавыя бібліятэчныя праграмы прававой накіраванасці. Так, у Віцебскай РЦБС распрацавана і актыўна дзейнічае мэтавая праграма “Падлетак. Бібліятэка. Час”, аршанскія гарадскія бібліятэкі імя А. Пушкіна і М. Горкага працягвалі работу па мэтавай комплекснай праграме “Грамадзянін XXI стагоддзя – маладзёжная школа права”. Супрацоўнікі Полацкай гарадской бібліятэкі імя Ф. Скарыны распрацавалі комплекс праграм па прававым выхаванні моладзі: “Падлеткі ў свеце правоў”, “Правовой эрудит”, “Асновы прававых ведаў”. У рамках вышэйназваных праграм праведзена звыш 40 мерапрыемстваў.

Пытанням прававой тэматыкі быў прысвечаны семінар “Бібліятэка і выхаванне прававой культуры асобы”, які прайшоў на базе Віцебскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага.

АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАБОТЫ З ЧЫТАЧАМІ

У 2011 годз бібліятэкі вобласці плённа працавалі над выкананнем рэспубліканскіх, абласных, рэгіянальных праграм і праектаў. У бібліятэках вобласці распрацаваны і актыўна дзейнічаюць разнастайныя праграмы:

– *патрыятычна-прававыя*: “Памяць” (Лёзненская ЦБС), “Не стареют душой ветераны” (Полацкая РЦБС), “Любовь к Отечеству храня” (Полацкая ГЦБС);

– *экалагічныя*: “Моя тихая Родина: экология родного края” (Бешанковіцкая ЦБС), “Чалавек і прырода” (Гарадоцкая ЦБС), “Дзеці. Экалогія. Кніга” (Наваполацкая ГЦБС), “Бібліятэка і экалогія” (Пастаўская ЦБС), “Береги свой дом – свою планету” (Чашніцкая ЦБС),

профілю, у тым ліку 16 лялечных тэатраў.

Склалася і падтрымліваецца пэўная сістэма далучэння чытачоў да бібліятэкі, якая рэалізоўвалася праз арганізацыю і правядзенне экскурсій, святаў, Тыдняў бібліятэк, Дзён адчыненых дзвярэй.

З мэтай папулярызацыі дзейнасці бібліятэк супрацоўнікі Аршанскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А. С. Пушкіна правялі акцыю “Приглашаем прохожих в библиотеку”, якая была праведзена каля гарадскіх філіялаў. Сваё прафесійнае свята, Дзень бібліятэк, супрацоўнікі гэтай жа бібліятэкі пераўтварылі ў свята для сваіх чытачоў “Нескучный вечер в библиотеке”.

У бібліятэках Віцебскай ГЦБС 15 верасня была праведзена рэкламная акцыя Ліб-Моб “Як прайсці ў бібліятэку”. Актыўнымі ўдзельнікамі акцыі “Я дарю тебе книгу, библиотека” (Гарадоцкая ЦБ) сталі не толькі карыстальнікі бібліятэкі, але і жыхары горада. З 2010 года Верхнядзвінская ЦБС штоквартальна праводзіць сэмплінг-акцыю “Прапануе аўтабібліятэка”. Наваполацкая ГЦБС правяла для жыхароў і гасцей горада рэкламную сэмплінг-акцыю “Наваполацк, чытай!”. Маладыя супрацоўнікі бібліятэк выйшлі на вуліцы горада з рэкламнай прадукцыяй, прысвечанай бібліятэкам, кнігам, чытанню. Навапалачане з зацікаўленасцю аднесліся да гэтай акцыі.

ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ БІБЛІЯТЭКАРАЎ. МАРКЕТЫНГАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

З павышэннем ролі сучасных бібліятэк у грамадстве ўзрастаюць і патрабаванні да метадычных службаў, якія забяспечваюць рух бібліятэк наперад, стымулююць творчую актыўнасць і ініцыятыву, аказваюць метадычную і практычную дапамогу бібліятэкам рэгіёнаў па арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва.

Сярод формаў павышэння кваліфікацыі па-ранейшаму самымі папулярнымі застаюцца рэспубліканскія, абласныя і раённыя семінары,

прэзентацыі кніг “Беларусь праваслаўная”, “Чудо Рождества”, духоўныя чытанні “Чытаем Біблію разам”, “Адзінствам і любоўю ўратуемся” знаёмілі наведвальнікаў бібліятэк з гісторыяй праваслаўя, сімваламі веры. Аршанская гарадская бібліятэка імя М. Горкага працягвае працу над рэалізацыяй мэтавай комплекснай праграмы “Невычэрпныя крыніцы духоўнасці”. З мэтай павышэння ўзроўню духоўна-маральнай і праваслаўнай свядомасці ў рамках дадзенай мэтавай комплекснай праграмы ў бібліятэцы прайшлі цікавыя мерапрыемствы: гадзіна духоўнасці “Наполните сердце теплом и верой”, свята духоўнасці “Свет духоўнасці не згасне, гадзіна праваслаўя “Біблія – першая кніга”, праваслаўныя сустрэчы “Уваскрэснуць у Хрысце Уваскросным!”, духоўна-пазнавальная гадзіна “Покрова Божьей Матери.

ПРАФІЛАКТЫКА ЎЗДЗЕЯННЯ ДЭСТРУКТЫЎНЫХ РЭЛІГІЙНЫХ АБШЧЫН І ПСІХАКУЛЬТАЎ (СЕКТЫ І ІНШАЕ)

У мэтах папярэджвання магчымага з’яўлення і ўплыву дэструктыўных рэлігійных абшчын і псіхакультаў на насельніцтва ў бібліятэках вобласці праводзіліся гутаркі-дыялогі: “Секты – павуціна для моладзі”, “Падлетак і суіцыд”, “Асцярожна, секта”, “Сучасныя маладзёжныя субкультуры”, “Асцярожна, секта!” (Віцебская РЦБС, Віцебская ГЦБС), гадзіны інфармацыі: “Секта. Знай в лицо, умей бороться”, “Не стань ахвярай секты” (Глыбоцкая ЦБС). На базе Багатырскай сельскай бібліятэкі Полацкай РЦБС у рамках семінара быў праведзены круглы стол “Секты растаўляюць сеткі”, Талачынская раённая бібліятэка правяла сумесны семінар работнікаў культуры, адукацыі і ідэалогіі на тэму “Процідзеянне ўплыву дэструктыўных рэлігійных сект і псіхакультаў”.

Усяго ў 2011 годзе праведзена больш за 27 тысяч мерапрыемстваў (у тым ліку каля 23 тысяч – у сельскіх філіялах). Пры бібліятэках вобласці працуюць 524 аматарскіх аб’яднанні рознагу

“Экалогія Міёршчыны” (Міёрская ЦБС);

– *краязнаўчыя*: “Вяртанне да вытокаў” (Лёзненская ЦБС), “Вытокі” (Віцебская РЦБС), “Што можа быць радней зямлі сваёй” (Чашніцкая ЦБС), “Мой родны край – мае вытокі” (Браслаўская ЦБС), “Жывая памяць Ушаччыны” (Ушацкая ЦБС), “Зямля, што нам дадзена лёсам” (Шаркаўшчынская ЦБС), “Памяць Шуміліншчыны” (Шумілінская ЦБС), “Спадчына” (Верхнядзвінская ЦБС), “Мая Полаччына” (Полацкая ГЦБС);

– *маральна-духоўныя*: “Дар дабрыні і міласэрнасці” (Бешанковіцкая ЦБС), “Бібліятэка і міласэрнасць” (Гарадоцкая ЦБС), “Міласэрнасць” (Сенненская ЦБС), “Невычэрпныя крыніцы духоўнасці” (Аршанская гарадская бібліятэка імя М. Горкага), “Шлях да духоўнай крыніцы” (Шаркашчынская ЦБС), “Чулае сэрца”(Полацкая ГЦБС) ;

– *прапаганда здаровага ладу жыцця ладу*: “Здоровый образ жизни” (Міёрская ЦБС), “Лад жыцця – здароўе” (Браслаўская ЦБС), “Падлетак і яго здароўе” (Лепельская ЦБС), “Здароўе – жыцця ключы” (Докшыцкая ЦБС).

Вывучэнне сваіх каранёў, звычаяў і традыцый продкаў, выхаванне пачуцця годнасці, гонару і павагі, культуры знаходзяцца ў цэнтры ўвагі бібліятэк вобласці**.** Мэта дзейнасці бібліятэк – выявіць, сабраць, захаваць і даць у карыстанне ўвесь масіў **краязнаўчых дакументаў**, якія па змесце маюць дачыненне да роднага краю.

Карыстальнікі бібліятэк актыўна ўдзельнічалі ў сустрэчах з краязнаўцамі, творчай інтэлігенцыяй**,** наведвалі комплексныя мерапрыемствы і прэзентацыі. Так, у Верхнядзвінскай ЦБС да 100-годдзя з дня нараджэння мастака А. С. Каржанеўскага, ураджэнца вёскі Валынцы, была праведзена прэзентацыя “З любоўю да роднай зямлі”. зямлі”. Удзельнікі гісторыка-краязнаўчай вандроўкі “Наш родны край прыгожы самы” здзейснілі віртуальнае падарожжа па памятных мясцінах вёскі Валынцы. *У* 2011 годзе бібліятэкары гэтай ЦБС прынялі актыўны ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе на лепшы краязнаўчы куток і сцэнарый “Я

раскажу табе пра дзіўны край, што мне свяцей усіх святынь у сэрцы”.

Супрацоўнікі Глыбоцкай раённай бібліятэкі ладзілі свята “Сэрцам роднага слова_краніся…”, на якое запрасілі члена Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага Саюза журналістаў гумарыста, драматурга, журналіста Уладзіміра Сауліча і кандыдата гістарычных навук Мікалая Півавара, аўтара даведніка “Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы ХХ – пачатку ХХ1 стагоддзя”. Традыцыйна, у жнівеньскія дні, бібліятэкары Глыбоцкай ЦБС адзначылі 150-годдзе знакамітага земляка І. Буйніцкага, заснавальніка беларускага тэатра.

“Сам я з Дняпра з-пад Оршы, са шляху з вараг у грэкі” – пад такой назвай у цэнтральнай гарадской біблятэцы імя А. С. Пушкіна прайшло мерапрыемства ў рамках літаратурнай гасцёўні і прэзентацыя выставы кніг з асабістай бібліятэкі І. Д. Сіпакова, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужанага дзеяча культуры Беларусі..

Асабістая бібліятэка Івана Данілавіча Сіпакова лічыцца адной з лепшых у Мінску. Амаль уся беларуская літаратура ў зборы – з аўтографамі У. Ф. Луцэвіч, жонкі Янкі Купалы, Генадзя Бураўкіна, Ніла Гілевіча, Алега Лойкі, Юркі Гаўрука, Леаніда Дайнекі, Алеся Бачылы і многіх іншых.

Сваю бібліятэку Іван Данілавіч Сіпакоў перадаў у спадчыну цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, дзе плануецца адкрыццё чытальнай залы імя Янкі Сіпакова.

Бібліятэкі вобласці працягваюць актыўна ўдзельнічаць ў рэспубліканскай акцыі **“Чытаем па-беларуску**”. Роднае слова гучала на літаратурных хвілінках, святах роднай мовы, літаратурных імпрэзах, гадзінах паэзіі, вечарынах, паэтычных вандроўках.

Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка Гарадоцкай ЦБС у рамках акцыі праводзіла конкурс сярод школьнікаў-чытачоў “Размаўляй са мной па-беларуску”, бібліятэкі Віцебскай РЦБС правялі Тыдзень беларускай літаратуры, гісторыі і культуры “Сведкі сівой даўніны”. У Дубровенскай ЦБС адбыўся семінар “Работа з беларускай кнігай –

“Чысціня вакол нас”, бібліятэкі Пастаўскай і Чашніцкай ЦБС удзельнічалі ў экалагічнай акцыі “Падары дрэву жыццё”.

Прыемна адзначыць, што некалькі бібліятэк вобласці атрымалі фінансавую падтрымку ад раёных інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя (Сенненская, Лёзненская ЦБ, Коханаўская гарпасялковая бібліятэка, Наваполацкая гарадская бібліятэка імя С. Маршака, Шаркаўшчынская дзіцячая бібліятэка, Лужкоўская і Іёдская сельскія бібліятэкі Шаркаўшчынскай ЦБС). Гэтыя сродкі пайшлі на падпіску на перыядычныя выданні і набыццё літаратуры прыродазнаўчай тэматыкі, абсталяванне для экалагічных куткоў.

Успаміны аб Чарнобыльскай аварыі кожны год 26 красавіка вяртаюць нас да сумнай даты ў беларускай гісторыі. Аб гэтым сведчаць і тыя мерапрыемствы, што прайшлі ў бібліятэках вобласці да 25-годдзя Чарнобыльскай катастрофы: агляды-выставы “Чарнобыль: Боль страт. Надзеі. Абнаўленне”, “Боль Чарнобыля ў сэрцах”, гадзіны трывожнай інфармацыі “Чарнобыль: легенда, быль, падзея”, “Чарнобыль - трывога нашых дзён, “Горкая кветка палын”, “Белая Русь. Черная быль”. Сярод найбольш цікавых мерапрыемстваў з прымяненнем кам’ютарных тэхналогій неабходна адзначыць наступныя: літаратурныя вечарыны “Чарнобыльская малітва”, “Чернобыль: беде 25 лет” (Докшыцкая, Лепельская ЦБС), гадзіны смутку “Чорны боль Белай Русі”, “Пад знакам палыновай зоркі” (Лёзненская ЦБС). Перасоўная бібліятэка Дубровенской ЦБС арганізавала для вучняў Ляхаўскай школы пазнавальную гадзіну “Чарнобыль – боль, які спальвае сэрца.”

Важным напрамкам работы бібліятэк з’яўляецца маральна-духоўнае выхаванне. Бібліятэкі значна пашырылі сферу сумеснай дзейнасці з праваслаўнай царквой па пытаннях маральнага і духоўнага выхавання дзяцей, моладзі і іншых катэгорый насельніцтва. Урокі духоўнасці “Да дабра праз слова”, “И сердце волнует святое и светлое”, “Скарбонка духоўнасці храма”, “Месца і роля рэлігіі ў жыцці чалавека”, урокі дабрыні “Добрае слова што ясны дзень”, “Храм веры ў сэрцы маім”,

ЦБС), “Пусть мир для них станет добрее” (Ушацкая ЦБС), “Книга-103” (Віцебская ГЦБС), “Дом, дзе жыве інвалід” (Докшыцкая ЦБС).

Найбольшага клопату патрабуюць ад устаноў культуры людзі сталага ўзросту (асабліва адзінокія) і інваліды. Чытачы з праблемамі здароўя ў Віцебскай ГЦБС маюць магчымасць карыстацца службай “Кніга – на дом” і атрымаць дамоў кнігу, у тым ліку і агучаную. У 2011 годзе паслугамі гэтай службы карысталіся 45 чалавек. Амаль усе бібліятэкі вобласці практыкавалі наведванні і віншаванні на даму інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны з нагоды Дня Перамогі, Дня пажылых людзей, Дня інвалідаў, дастаўку кніг і перыядычных выданняў на дом па заяўках, для іх ладзіліся вечары адпачынку “Годы украшают человека”, “Залатая восень жыцця” (Аршанская РЦБС, Бешанковіцкая, Верхнядзвінская ЦБС), тэматычныя вечарыны “Какие еще наши годы”, “Каб не маўчала душа”, “Годами богаты, душой молодые”, “О чем прошелестел осенний лист” (Докшыцкая ЦБС), вечарыны ўшанавання “О, восеньскі ўзрост”, “Жыццё пражыць – не поле перайсці”, бібліятэчныя пасядзелкі “Залаты ўзрост”, “Живем мы все воспоминаниями”, “Калі не старыцца душа”, “Нам года не беда”, традыцыйныя выставы творчасці інвалідаў “З любоўю і фантазіяй”, “І остались за стеклом все мои печали” ладзіліся ў Верхнядзвінскай, Аршанскай РЦБС і ГЦБС.

Бібліятэкі вобласці падтрымлівалі наладжаныя трывалыя сувязі з грамадскімі цэнтрамі дапамогі дзецям-інвалідам. У шырокую практыку ўвайшло правядзенне для такаіх дзяцей ранішнікаў, гульнявых праграм, святаў дзяцінства “Добра мы адпачываем”, “Падарожжа ў Казкаград”, “Дзяцінству сонца падарыце”, “Падарожжа ў краіну яе Вялікасці Кнігі”.

Выхаванне **экалагічнай культуры** – важны напрамак у дзейнасці бібліятэк Віцебскай вобласці. У межах мэтавых праграм, па якіх працуюць бібліятэкі, былі арганізаваны дэкады, месячнікі, тыдні экалогіі і прыродазнаўства, экалагічныя вандроўкі, экалагічныя круізы, месячнікі прапаганды кніг па экалогі: “Спасем земную красоту”, “Как прекрасен этот мир”. Бібліятэкі Глыбоцкай ЦБС актыўна ўдзельнічалі ў эка-акцыі

прыярытэтны накірунак сучаснай бібліятэкі”, на які былі запрошаны беларускія пісьменнікі Анатоль Зэкаў і Эрнэст Ялугін, намеснік галоўнага рэдактара прафесійнага часопіса “Бібліятэка прапануе” Л. Несцяровіч. На мерапрыемстве прысутнічалі бібліятэкары раёна, вучні і настаўнікі школ горада. Усе жадаючыя мелі магчымасць набыць мастацкія творы пісьменнікаў з аўтографамі аўтараў, а таксама метадычныя матэрыялы для бібліятэчнай работы, выдадзеныя часопісам “Бібліятэка прапануе”.

Папулярызацыі беларускага слова садзейнічалі традыцыйныя літаратурныя чытанні: “Звіні, спявай, Купалаўская ліра” (свята паэзіі ў Ляўках, прысвечанае творчасці Я. Купалы) – Аршанская РЦБС; Дубоўкаўскія чытанні “Верш у кішэні” (Пастаўская ЦБС); “Гарадоцкі Парнас” (Гарадоцкая ЦБС); Караткевічскія паэтычныя чытанні” (Аршанская ГЦБС).

На працягу 2011 года бібліятэкі актыўна адзначылі юбілеі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў: І. Шамякіна, І. Мележа, М. Багдановіча, Н. Гілевіча, В. Віткі, К. Крапівы, Э. Агняцвет, прапагандавалі новыя творы беларускіх пісьменнікаў: В. Праўдзіна, Н. Батраковай, У. Ліпскага, І. Стадольніка, Р. Баравіковай.

Пад пільнай увагай бібліятэкараў пры арганізацыі масавых мерапрыемстваў былі тэмы, звязаныя з **фарміраваннем здаровага ладу жыцця.** Пастаянныя выставы *інфармавалі*: “Здароўе чалавека – багацце грамадства”, “Азбука здароўя”, “Учимся быть здоровыми”, “Компас у краіну здароўя” (Дубровенская, Сенненская Чашніцкая ЦБС); *папярэджвалі*: урокі-перасцярогі “Імя бяды – наркотыкі”, “На конце иглы”, гадзіны пратэсту “Курить или не курить”, “Маскарад вредных привычек”, “Таксікаманіі – Не”, гадзіны трывожных звестак “Не подвергай себя риску”, “Вверх по лестнице, ведущей вниз”, гадзіны прафілактыкі “Учись быть здоровым”, “Война с курением”, “Путь в никуда” (Браслаўская, Лёзненская, Расонская, Ушацкая ЦБС); *прапаноўвалі*: урокі маралі “Я выбіраю жыццё”, “Я плюс ты, минус ВИЧ-инфекция”, інфармацыйныя гадзіны “Ворагі нашага здароўя”, “Дорога,

ведущая в пропасть”, “Борьба с невидимым врагом”, агляды літаратуры “Наркаманія – знак бяды”, “Не ламай сабе жыццё” (Полацкая РЦБС, Віцебская ГЦБС, Шаркаўшчынская ЦБС); *праводзілі:* тэматычныя вечары “Колокола тревогі”, “Мы супраць наркотыкаў”, гутаркі “Ці ўсё мы ведаем аб шкодзе курэння”, “Імя бяды – наркотыкі”, круглыя сталы “Зберажы сябе для жыцця”, “Мы за жыццё без наркотыкаў”.

Міёрская, Гарадоцкая, Докшыцкая, Шаркаўшчынская ЦБС актыўна ўдзельнічалі ў рэспубліканскай акцыі “Беларусь против табака” (24-31 мая). У бібліятэках ладзіліся выставы-парады “Книга и газета вместо сигареты”, “Что уносит дым сигареты” “Моладзь супраць шкодных звычак”, “Дым, уносящий здоровье”, урокі-дыялогі “Шкодныя звычкі”, “Дым табачный не глотай, лучше книгу прочитай”, “Я здароўе берагу – сам сабе дапамагу”, вечары пытанняў і адказаў.

Важным напрамкам работы бібліятэк вобласці з’яўляецца **патрыятычнае выхаванне**. Сучасныя інфармацыйныя рэсурсы публічных біліятэк дазваляюць паспяхова ўкараняць новыя формы работы, якія робяць карысным і дзейсным дыялог з моладдзю. Пры правядзенні масавых мерапрыемстваў супрацоўнікі бібліятэк выкарыстоўвалі відэа-урокі і відэа-гутаркі “У памяці назаўсёды”, “Вспомним всех поименно”, “Дзяцінства, апаленае вайной”, “Маршалы Перамогі”, медыа-урокі “Чорнае крыло над людскімі лёсамі”, “Памяць зніклых вёсак” (Лепельская ЦБС), электронныя прэзентацыі кніг, відэапрэзентацыі “Цытадэль над Бугам”, “Маю гонар Радзіме служыць” (Віцебская і Наваполацкая ГЦБС). Наведвальнікі бібліятэк актыўна ўдзельнічалі ў акцыях “Прачытай кнігу пра вайну” (Докшыцкая , Віцебская РЦБС), прысутнічалі на патрыятычных гадзінах, вечарах мужнасці, гутарках, вечарах-сустрэчах з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Супрацоўнікі Лепельскай ЦБС прымалі ўдзел раённым свяце “Ёсць у памяці імгненні вайны”. На пляцоўцы пад назвай “На прывале” бібліятэкары арганізавалі “Франтавую бібліятэку”, дзе знаёмілі

наведвальнікаў з літаратурай аб вайне на выставе-праглядзе “У кніжнай памяці – імгненні вайны”. Актыўныя наведвальнікі прынялі ўдзел у інтэлектуальным марафоне “Дарогамі Перамогі”, дзе самы эрудыраваны атрымліваў прыз за правільныя адказы на пытанні віктарыны. Аматары паэтычнага слова з задавальненнем слухалі вершы пра вайну.

На працягу справаздачнага годаа года супрацоўнікі Аршанскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А. С. Пушкіна пачалі работу па зборы і апрацоўцы матэрыялаў: успамінаў аршанцаў–ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, вязняў, падпольшчыкаў, партызан, юных патрыётаў пра дзень Вялікай Перамогі. Бібліятэкары паставілі перад сабой задачу – запісаць і захаваць для наступных пакаленняў успаміны жывых сведкаў пра дзень Вялікай Перамогі. Вынікам гэтай творчай работы стала **прэзентацыя рукапіснай кнігі памяці “Мая Перамога”**, на якую былі запрошаны ветэранаы, удзельнікі вайны. Актыўны ўдзел у напісанні аднаго з раздзелаў кнігі прынялі вучні школ горада, якія ў сваіх сачыненнях выказалі думкі пра важнасць і значнасць Перамогі для сучаснай моладзі. Гэты хвалюючы твор даў тэму для глыбокіх разважанняў пра патрыятызм, пра подзвіг, самаахвяраванні ў імя подзвігу.

Усе бібліятэкі Віцебскай ГЦБС актыўна ўдзельнічалі ў акцыі памяці “Дзень белых жураўлёў”, пад час якой ад бібліятэк, альбо бліжэйшых помнікаў і памятных стэл былі запушчаны паветраныя шары з белымі жураўлямі - птушкамі памяці аб загінуўшых на вайне. Акцыя пашырае свае межы: да яе правядзення актыўна далучыліся СШ № 46, ВГПТК лёгкай прамысловасці і інш.

У справаздачным годзе актыўна вялася работа бібліятэк з **сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва**. Выхаванне міласэрнасці было мэтай дабрачынных акцый: “Не спазніся з дабрынёй” (Браслаўская ЦБС), “Міласэрнасць” (Полацкая РЦБС), “Жизнь дана на добрые дела” (Гарадоцкая ЦБС), “Прыміце нашы віншаванні” (Аршанская РЦБС), “Сцяжынка ў адзінокі дом” (Віцебская РЦБС), “Кніга на дом” (Лёзненская ЦБС), “Жыць і бачыць ў жыцці прыгажосць” (Сенненская